ЧАРОЎНАЕ СВЯТЛО СЯБРОЎСТВА

16 кастрычніка Гродна наведала дэлегацыя пісьменнікаў з горада Брэста на чале са старшынёй Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Таццянай Дземідовіч.

Госці здзейснілі прагулку па гістарычным цэнтры Гродна, усклалі кветкі да Вечнага агню ў Парку Жылібера, наведалі Музей Максіма Багдановіча і офіс ГрАА СПБ, выступілі перад гродзенскімі бібліятэкарамі і аматарамі мастацкага слова на літаратурным вечары «Калі ты душою, як крэпасць над Бугам…», які адбыўся ў Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы імя А. Макаёнка.

Берасцейскія творцы ўжо неаднаразова прымалі ў сябе калег па Гродзенскім абласным аддзяленні СПБ. З іх дапамогай паэты Аляксандр Марозаў (Астравецкі раён), Руслан Піваварaў (Ліда); літаратурны крытык з Гродна Дзмітрый Радзівончык мелі магчымасць прадэманстраваць сваю творчасць знатакам прыгожага пісьменства



горада над Бугам. Можна не сумнявацца – у Брэсце нам заўсёды рады, і творчыя сяброўскія кантакты будуць працягвацца. Кастрычніцкая літаратурная сустрэча ў Гродне стала візітам у адказ. Паэтэса, публіцыст, дзіцячая пісьменніца Таццяна Дземідовіч, паэты Васіль Барысюк і Аксана Валуй, празаік Ірына Фаміна расказалі гродзенцам пра асноўныя напрамкі сваёй творчасці, прачыталі свае творы, ажыццявілі прэзентацыі сваіх кніг, падарылі бібліятэцы памятныя падарункі і ўласныя аўтарскія выданні з аўтографамі.

З прывітальным словам выступілі старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Людміла Антонаўна Кебіч; члены СПБ Руслан Піваварaў (Ліда) і Дзмітрый Радзівончык (Гродна). Гучалі музычныя нумары.

Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкай імя А. Макаёнка спецыяльна да гэтай падзеі была падрыхтаваная выстава кніг сучасных брэсцкіх аўтараў, дэманстравалася музычнае відэа пра Брэст. Выступленні ўдзельнікаў мерапрыемства гродзенская аўдыторыя сустракала гучнымі апладысментамі. І свята атрымалася. Яркае, шчырае, напоўненае святлом узаемнай сяброўскай сімпатыі, яно пацвердзіла ідэйнае і творчае адзінства сучасных літаратараў з розных гарадоў Беларусі. І таму яшчэ не раз абавязкова паўторыцца.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

На фота: дэлегацыя пісьменнікаў г. Брэста ў гасцях у сваіх гродзенскіх калег. 16 кастрычніка 2026 года.



У гэты дзень у выкананні трубача на Гродзенскай пажарнай каланчы прагучала «Беловежская пуща» А. М. Пахмутавай. Супадзенне?





Берасцейскія пісьменнікі і Святы Губерт





Берасцейскія пісьменнікі ў Музеі Максіма Багдановіча








САЮЗ
ПІСЬМЕННІКАЎ
БЕЛАРУСІ



Таццяна Дземідовіч




Васіль Барысюк



Аксана Валуй



Ірына Фаміна



Дырэктар ДУК «ЦБС г. Гродна» Кацярына Раманаўна Расіцан



Старшыня ГрАА СПБ, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Л. А. Кебіч


ПІСЬМЕННІКІ
НАШАГА КРА
«КАЛІ ТЫ ДУШОЮ,
НАД БУГАМ...
ьменнікі з брэста
Неба ў дыяментах
Жыццёвыя путы
Светлая дарога ладому


ПІСЬМЕННІКІ
НАШАГА КРА
«КАЛІ ТЫ ДУШОЮ,
ПІСЬМЕННІКІ З БРЭСТА
НА СКРЫЖАВАН
РЭК І ЛЁСАЎ
Неба ў дыяментах
Жыццёвыя путы
Останусь навсегда...
Мармеладное лето
Вока фонарщик спит
Приключения ежонка Кактуса


Неба ў дыяментах
Жыццёвыя путы
Людміла КЕБІЧ
ДАМІНАНТЫ
Рэха маіх слядоў
Навстрэчу попутному ветру
Русалан ТІВОНЧАРОЎ


ПІСЬМЕННІКІ НАШАГА КРАЮ
«КАЛІ ТЫ ДУШОЮ, ЯК КРЭПАСЦЬ НАД БУГАМ..
Літаратурны вечар
У НАС У ГАСЦЯХ ПІСЬМЕННІКІ З БРЭСТА
Мармеладное лето
Вока фонарщик спит
Ключенія ёжонка Кактуса





Л. А. Кебіч і Т. А. Дземідовіч



Член СПБ, паэт Руслан Півавараў (Ліда)


Дзмітрый Радзівончык (СПБ-Гродна)





Пасля мерапрыемства



Гродзенскія і берасцейскія пісьменнікі разам



Васіль Барысюк і Юлія Мельнік


Член СПБ, паэт Васіль Барысюк (Брэст) з гродзенскімі калегамі



Ірына Фаміна
і Аксана Валуй
у Каложскім парку



Берасцейскія пісьменніцы ў Гродне



Фота Віктара Дземідовіча,
Руслана Півавараваа,
Дзмітрыя Радзівончыка
і Юліі Мельнік

www.pisateli.by